Журнал Белорусского государственного университета. История. 2020;4:34–47
Journal of the Belarusian State University. History. 2020;4:34–47

*УДК 355.486:356.15(438)«1944/1946»*

# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ОТРЯДА КАПИТАНА Р. РАЙСА (БУРОГО) НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛОСТОЧЧИНЫ В 1944–1946 гг. В ПОЛИТИКЕ ПАМЯТИ РЕСПУБЛИКИ ПОЛЬШИ

***Л. А. КОЗИК***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Исследуется проблема отражения в политике памяти современной Республики Польши деятельности отряда под командованием Р. Райса (Бурого) на Белосточчине в 1944–1946 гг. Цель статьи – проанализировать публичные практики, места памяти и их роль в формировании и отражении коллективной памяти о деятельности отряда Р. Райса, представителей которого причисляют к «проклятым солдатам». Отмечено, что завершенное в 2005 г. следствие пришло к выводу, что действия отряда имеют признаки геноцида. Однако проведенный анализ показал существование двух противоположных нарративов в рамках очерченной проблемы. Один из них – националистический и антикоммунистический – транслируется государством посредством Института национальной памяти, музейных учреждений, а также правыми политическими партиями, движениями и общественными организациями и близкими к ним СМИ. В соответствии с ним Р. Райс выступает героем, который вел борьбу в интересах польского государства. Ответственность за убийство белорусов – граждан Польши сторонники этого подхода возлагают на самих жертв. Иной нарратив транслируется белорусскими общественными организациями и СМИ. Они стремятся сохранить в обществе память о трагедии 1946 г. и однозначно оценивают деятельность отряда Р. Райса как преступную. Сделан вывод о том, что современная польская историческая политика частично отходит от гуманистических, общечеловеческих ценностей, делает акцент на националистическом видении истории и фактически игнорирует интересы белорусов Белосточчины.

***Ключевые слова:*** политика памяти; Польша; белорусы; Ромуальд Райс; «проклятые солдаты»; Институт национальной памяти; геноцид.

***Благодарность.*** Автор высказывает искренние слова благодарности за ценные советы и помощь в подготовке статьи доценту А. Г. Цымбалу (Минский государственный лингвистический университет) и профессору Э. Мироновичу (Белостокский университет).

# ДЗЕЙНАСЦЬ АТРАДА КАПІТАНА Р. РАЙСА (БУРАГА) НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАСТОЧЧЫНЫ Ў 1944–1946 гг. У ПАЛІТЫЦЫ ПАМЯЦІ РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧЫ

***Л. А. КОЗІК***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Даследуецца праблема адлюстравання ў палітыцы памяці сучаснай Рэспублікі Польшчы дзейнасці атрада пад камандаваннем Р. Райса (Бурага) на Беласточчыне ў 1944–1946 гг. Мэта артыкула – прааналізаваць публічныя практыкі,

**О б р а з е ц   ц и т и р о в а н и я:**
Козік ЛА. Дзейнасць атрада капітана Р. Райса (Бурага) на тэрыторыі Беласточчыны ў 1944–1946 гг. у палітыцы памяці Рэспублікі Польшчы. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя*. 2020;4:34–47.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-4-34-47

**F o r   c i t a t i o n:**
Kozik LA. The partisan unit under the command of captain R. Rajs (Bury) activity on the territory of Białystok region in 1944–1946 in the politics of memory of the Republic of Poland. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2020;4:34–47. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-4-34-47

**А в т о р:**
***Любовь Антоновна Козик*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории южных и западных славян исторического факультета.

**A u t h o r:**
***Lioubov A. Kozik***, PhD (history), docent; associate professor at the department of Southern and Western Slav's history, faculty of history.
*lubov.kozik@gmail.com*

месцы памяці і іх ролю ў фарміраванні і адлюстраванні калектыўнай памяці аб дзейнасці атрада Р. Райса, прадстаўнікоў якога залічваюць да «праклятых салдат». Адзначаецца, што следства, якое завяршылася ў 2005 г., прыйшло да высновы, што дзейнасць Р. Райса мела прыкметы генацыду. Аднак праведзены аналіз паказаў існаванне ў Польшчы двух супрацьлеглых наратываў у межах акрэсленай праблемы. Адзін з іх – нацыяналістычны і антыкамуністычны – трансліруецца дзяржавай праз Інстытут нацыянальнай памяці, музейныя ўстановы, а таксама правымі палітычнымі партыямі, грамадскімі арганізацыямі і блізкімі да іх СМІ. У адпаведнасці з ім Р. Райс выступае героем, які вёў барацьбу ў інтарэсах польскай дзяржавы. Адказнасць за забойства беларусаў – грамадзян Польшчы прыхільнікі гэтага падыходу ўскладаюць на саміх ахвяр. Другі наратыў трансліруецца беларускімі грамадскімі арганізацыямі і СМІ. Яны імкнуцца захаваць у грамадстве памяць аб трагедыі 1946 г. і адназначна ацэньваюць дзейнасць атрада Р. Райса як злачынную. Зроблена выснова аб тым, што ў сучаснай польскай гістарычнай палітыцы назіраецца частковы адыход ад гуманістычных, агульначалавечых каштоўнасцей, робіцца акцэнт на нацыяналістычным бачанні гісторыі і фактычна ігнаруюцца інтарэсы беларусаў Беласточчыны.

***Ключавыя словы:*** палітыка памяці; Польшча; беларусы; Рамуальд Райс; «праклятыя салдаты»; Інстытут нацыянальнай памяці; генацыд.

***Падзяка.*** Аўтар выказвае шчырыя словы ўдзячнасці за каштоўныя парады і дапамогу ў падрыхтоўцы артыкула дацэнту А. Г. Цымбалу (Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт) і прафесару Э. Мірановічу (Беластоцкі ўніверсітэт).

# THE PARTISAN UNIT UNDER THE COMMAND OF CAPTAIN R. RAJS (BURY) ACTIVITY ON THE TERRITORY OF BIAŁYSTOK REGION IN 1944–1946 IN THE POLITICS OF MEMORY OF THE REPUBLIC OF POLAND

***L. A. KOZIK***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The polish politics of memory concerning the activities of the unit under the command of captain R. Rajs (Bury) in Białystok region in 1944–1946 is considered in the article. The aim of the study is to analyse public practices, places of memory and their role in forming and reflecting the collective memory about R. Rajs's unit (whose representatives are referred to as «cursed soldiers»). The analysis of public practices, memorable days and places of memory in Poland revealed a confrontation between two narratives. The first one is the nationalist and anti-communist narrative. It is transmitted by the state through the Institute of National Remembrance, museum institutions, as well as by right-wing political parties, movement, public organisations and the media close to them. According to them, R. Rajs is a hero who fought in the interests of the Polish state. Another narrative is presented by Belarusian national minority, their public organisations and mass media. They try to preserve the memory of the 1946 tragedy in the society and define the activities of the R. Rajs's unit as crimes. The author emphasises that the judicial investigation completed in 2005 by the Institute of National Remembrance came to the conclusion that R. Rajs actions had signs of genocide. The author notes that the polish historical politics departs in some sense from humanistic, universal values. It focuses on the nationalist vision of history and actually ignores the interests of the Belarusians of Białystok region.

***Keywords:*** politics of memory; Poland; Belarusians; Romuald Rajs; «cursed soldiers»; the Institute of National Remembrance; genocide.

***Acknowledgements.*** The authors would like to express her sincere gratitude to docent A. G. Tsimbal (Minsk State Linguistic University) and full professor E. Mironowicz (University in Białystok) for the valuable advice and suggestions in the preparation of the article.

## Уводзіны

Крах камуністычнай сістэмы ў Польшчы ў 1989 г. прывёў да істотных змен у грамадска-палітычным і эканамічным жыцці краіны. Палітыкі, якія прыйшлі да ўлады, імкнуліся абгрунтаваць заканамернасць сваёй перамогі і ўласную легітымнасць, звяртаючыся да гістарычнага мінулага народа і краіны. Пераемнасць улады трансліравалася праз зварот да традыцый міжваеннай Польшчы (так званай 2-й Рэчы Паспалітай) і заявы пра пабудову 3-й Рэчы Паспалітай, што было замацавана ў Канстытуцыі Рэспублікі Польшчы 1997 г. Дадатковымі аргументамі сталі прызнанне польскім урадам у эміграцыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў 1990 г. і перадача паўнамоцтваў і прэзідэнцкіх рэгалій Леху Валенсу.

У новых умовах, калі адбывалася дэідэалагізацыя навукі (адкрыццё архіваў, плюралізм навуковых

падыходаў), з'яўляліся новыя тэмы для даследаванняў і магчымасці для пераацэнкі падзей мінулага. На гэтым фоне ў канцы 1990-х гг. у Польшчы пачаліся размовы пра неабходнасць выкарыстання гістарычнай навукі ў палітычных мэтах. Такая ідэя не была новай у Заходняй Еўропе. Упершыню тэрмін *Geschichtpolitics* быў выкарыстаны ў ФРГ у пачатку 1980-х гг., і звязваўся ён са спробай пераглядзець некаторыя ацэнкі мінулага і надаць больш пазітыўны характар нямецкаму патрыятызму. Аднак дзеянні ў гэтым напрамку сустрэлі моцную адмоўную рэакцыю навуковага асяроддзя. У тых умовах само паняцце *Geschichtpolitics* атрымала негатыўную афарбоўку і стала азначаць інтэрпрэтацыю гісторыі па палітычных, партыйных матывах і спробы запэўніць шырокія колы грамадства ў яе правільнасці [1, с. 8–9].

У Польшчы некаторы час ідэя выкарыстання гісторыі ў палітычных мэтах не знаходзіла шырокага распаўсюджання. Сітуацыя змянілася пасля парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў 2005 г., калі да ўлады прыйшлі правацэнтрысцкія палітыкі, аб'яднаныя вакол партыі «Права і справядлівасць». Можна сцвярджаць, што з гэтага часу пачалася выпрацоўка польскай гістарычнай палітыкі. У адрозненне ад Германіі ў Польшчы сама ідэя яе правядзення атрымала падтрымку часткі навуковай супольнасці.

Прыхільнікі правядзення гістарычнай палітыкі заяўляюць, што яна накіравана на папулярызацыю спадчыны народа ў свядомасці грамадства, паказ каштоўнасці гісторыі Польшчы як унутры краіны, так і на міжнародным узроўні, фарміраванне пачуцця гонару за гістарычнае мінулае [2, s. 8, 17]. Не ўсе даследчыкі пагаджаюцца з гэтым меркаваннем. У польскай гістарычнай палітыцы ў XXI ст. яны бачаць антыліберальную, пранацыянальную логіку, накіраваную на захаванне нацыянальнай супольнасці[1]. Яе галоўным праваднікам у Польшчы выступае Інстытут нацыянальнай памяці (ІНП).

Інстытут быў утвораны ў 1999 г. на базе Галоўнай камісіі па расследаванні злачынстваў супраць польскага народа (да 1990 г. – Галоўная камісія па расследаванні злачынстваў гітлерызму). Сярод задач ІНП – правядзенне следства ў справе «нацысцкіх і камуністычных злачынстваў, у тым ліку злачынстваў у дачыненні да асоб польскай нацыянальнасці ці польскіх грамадзян іншай нацыянальнасці, што былі здзейснены ў перыяд з 8 лістапада 1917 па 31 ліпеня 1990 г.»[2], пошукавыя працы па высвятленні месцаў знаходжання асоб, якія загінулі ў барацьбе за незалежнасць і аб'яднанне польскай дзяржавы, у змаганні з таталітарнай сістэмай ці ў выніку таталітарных рэпрэсій і этнічных чыстак у той час. Таксама ІНП ажыццяўляе дзейнасць, накіраваную на захаванне памяці пра гістарычныя падзеі, месцы і асоб у гісторыі барацьбы і пакутніцтва польскага народа ў краіне і за яе межамі, месцы памяці і пакутніцтва іншых народаў на тэрыторыі Польшчы ў перыяд з 8 лістапада 1917 па 31 ліпеня 1990 г.[3] ІНП уключае ў свой склад розныя структурныя падраздзяленні, сярод якіх ёсць і Камісія па расследаванні злачынстваў супраць польскага народа[4].

Аналізуючы асаблівасці трансляцыі і ўспрымання інфармацыі пра дзейнасць атрада Р. Райса на Беласточчыне, неабходна вызначыць, што навукоўцы разумеюць пад паняццямі «гістарычная палітыка» і «палітыка памяці», якія выкарыстоўваюцца ў межах *memory studies*. Нягледзячы на існаванне вялікай колькасці літаратуры па гэтай праблеме, можна сцвярджаць, што адзінага падыходу да іх вызначэння не існуе. Некаторыя даследчыкі ставяць знак роўнасці паміж гэтымі паняццямі і лічаць іх узаемазамяняльнымі, іншыя бачаць адрозненні паміж імі і вылучаюць асаблівасці ў выкарыстанні адпаведных тэрмінаў [3, с. 194–202].

У польскай гістарычнай навуцы пераважна выкарыстоўваецца паняцце «гістарычная палітыка». Пад ім разумеюць палітычна матываваную інтэрпрэтацыю мінулага, якая з'яўляецца элементам палітычнага дзеяння дзяржавы і іншых суб'ектаў і ставіць сваёй мэтай уплыў на свядомасць грамадства [4, s. 49]. Падобным чынам яго тлумачаць расійскія і ўкраінскія спецыялісты. Даследчыкі сыходзяцца ў меркаванні, што гістарычная палітыка ахоплівае розныя формы калектыўных уяўленняў пра мінулае і яго рэпрэзентацый, у тым ліку прафесійную гістарыяграфію. Для яе, з аднаго боку, характэрныя сітуацыі з непраўдзівай (фальшывай) прэзентацыяй гісторыі, а з другога – замоўчванне (забыццё) непрыемных фактаў у гісторыі [1, с. 10; 5, с. 18].

У сваю чаргу, палітыка памяці для шэрагу даследчыкаў выступае як больш вузкае паняцце, якое датычыцца розных форм грамадскіх практык і норм, звязаных з рэгуляваннем калектыўнай памяці. Яна мае дачыненне да юрыдычных пытанняў, месцаў памяці, так званых *transitional justice*, і не прадугледжвае інтэрвенцыю ў сферу прафесійнага гісторыяпісання і дыдактычнай гісторыі [1, с. 7; 4, s. 49; 5, с. 19].

---

[1]*Траба Р.* Польские споры об истории в XXI веке // Полит.ру [Электронный ресурс]. URL: https://polit.ru/article/2010/02/03/traba/ (дата обращения: 29.07.2020).

[2]O IPN // Instytut Pamięci Narodowej [Electronic resource]. URL: https://ipn.gov.pl/pl/o-ipn/24154,O-IPN.html (date of access: 25.06.2020). (Тут і далей пераклад наш. – *Л. К.*)

[3]Ibid.

[4]Statut Instytutu Pamięci Narodowej – Komisji Ścigania Zbrodni przeciw Narodowi Polskiemu [Electronic resource]. URL: https://ipn.gov.pl/pl/o-ipn/statut/85521,Statut-Instytutu-Pamieci-Narodowej-Komisji-Scigania-Zbrodni-przeciwko-Narodowi-P.html (date of access: 25.06.2020).

Іншае меркаванне выказвае расійская даследчыца В. Ю. Малінава. На яе думку, палітыка памяці мае ў першую чаргу дачыненне да калектыўнай памяці, якая абапіраецца на розныя крыніцы і вылучаецца прынцыповай выбіральнасцю і непаўнатой [6, с. 8]. Даследчыца лічыць, што палітыка памяці выступае больш шырокім паняццем, якое «апісвае любыя практыкі звароту да мінулага ў палітычным кантэксце, незалежна ад таго, ці яны складваюцца ў паслядоўную стратэгію» [6, с. 9], а гістарычная палітыка з'яўляецца адным з яе кампанентаў.

У дадзеным даследаванні выкарыстоўваецца больш вузкае разуменне палітыкі памяці, якое прадугледжвае зварот да публічных практык, звязаных з фарміраваннем і адлюстраваннем калектыўнай памяці, памятных дат, месцаў памяці і г. д. Аўтар свядома не разглядае гістарыяграфію дзейнасці атрада капітана Р. Райса (псеўданім – Буры) на Беласточчыне ў 1944–1946 гг., бо яе аналіз заслугоўвае асобнай публікацыі.

Праблема ўспрымання дзейнасці атрада капітана Р. Райса на Беласточчыне ў 1944–1946 гг. у сучасным польскім грамадстве знайшла адлюстраванне ў публікацыях польскай даследчыцы А. Мароз [7; 8]. Яе працы носяць міждысцыплінарны характар і прысвечаны аналізу адлюстравання дзейнасці Р. Райса ў калектыўнай памяці палякаў і беларусаў Падляшша. Аўтар падкрэслівае розніцу паміж паняццямі гісторыі і калектыўнай памяці і пазбягае ацэнкі «правільнасці» меркавання кожнага з бакоў. Даследчыца піша, што ў абагульненым выглядзе ацэнка дзеянняў Р. Райса часта даецца з пазіцыі жорсткага супрацьстаяння ў яго чорна-белым варыянце. Насамрэч сітуацыя больш складаная і ў ёй ёсць розныя адценні, якія А. Мароз і прыводзіць у сваіх даследаваннях.

У сваю чаргу, М. Орцюх засяроджвае ўвагу на дыскусіі вакол постаці Р. Райса на старонках прэсы і ў электронных медыя, якія, на яго думку, выступаюць часткай польскай гістарычнай палітыкі [9]. Асобу Р. Райса даследчык разглядае ў катэгорыі «праклятых салдат» (*żołnierzy wyklęci*) і паказвае іх успрыманне ў этнічна польскім і беларускім асяроддзях. М. Орцюх прыходзіць да высновы, што ва ўмовах гістарычнай палітыкі і гларыфікацыі дзейнасці «праклятых салдат» дзеючай уладай спрэчкі вакол Бурага яшчэ доўга будуць эмацыянальна балючым момантам у польскім грамадстве.

## Асноўная частка

У гады Другой сусветнай вайны ў польскім руху Супраціўлення склаліся дзве плыні. Адна з іх падпарадкоўвалася ўраду ў эміграцыі, другая была пракамуністычная, фактычна прасавецкая. Іх найбольш вядомымі фарміраваннямі з'яўляліся Армія краёва (АК) і Армія людова (АЛ) адпаведна. Пасля заканчэння вайны да ўлады ў Польшчы прыйшлі камуністы, якія ў сваёй палітыцы і прапагандзе вылучылі АЛ і прыхільнікаў камуністаў як станоўчых герояў, АК і яе саюзныя фарміраванні як адмоўных. Дадатковай прычынай непрымання апошніх было тое, што некаторыя ўдзельнікі адмовіліся падпарадкоўвацца загаду аб роспуску АК (студзень 1945 г.) і вырашылі весці ўзброеную барацьбу супраць устаноўленай у Польшчы ўлады[5], якая, у сваю чаргу, акрэслівала іх дзейнасць як бандыцкую і злачынную. Пасля ліквідацыі польскага ўзброенага падполля ў сярэдзіне 1950-х гг. дзейнасць гэтых фарміраванняў практычна не згадвалася ў публічнай прасторы, пра гэтых людзей «забылі» або згадвалі іх у негатыўным рэчышчы. Выключэннем сталі апазіцыйныя арганізацыі, якія ў 1970–80-я гг. у сваіх нелегальных выданнях станоўча выказваліся пра ўдзельнікаў пасляваеннага супраціву.

Пасля падзей 1989 г. у Польшчы пра людзей, якія са зброяй у руках змагаліся супраць пракамуністычных сіл у першыя пасляваенныя гады, пачалі гаварыць і пісаць, прысвячаць ім выставы і ладзіць у іх гонар канферэнцыі. У 1993 г. упершыню ў дачыненні да такіх асоб быў выкарыстаны тэрмін «праклятыя салдаты», гэта значыць тыя, каго выракліся, каго ўлада забыла, «пракляла». У другой палове 1990-х гг. гэты тэрмін пачаў актыўна выкарыстоўвацца ў публічнай прасторы, штуршком да чаго стала кніга Е. Шляскага «Праклятыя салдаты»[6]. У сучаснай Польшчы сінонімам адпаведнага тэрміна выступае паняцце «нязломленыя салдаты». Дырэктар Музея Войска польскага А. Булава так тлумачыць розніцу паміж імі: у тэрміне «праклятыя салдаты» робіцца акцэнт на знішчэнні памяці пра ўдзельнікаў

[5] У ліпені 1944 г. пры падтрымцы і актыўным удзеле савецкага кіраўніцтва ў Польшчы было абвешчана аб стварэнні Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення, які заявіў, што не прызнае ўрад у эміграцыі і з'яўляецца адзінай законнай сілай у краіне. У студзені 1945 г. ён быў ператвораны ў Часовы ўрад, які атрымаў афіцыйнае прызнанне СССР. Устаноўленая сістэма двоеўладдзя (польскі ўрад у эміграцыі, прызнаны ўсімі краінамі, за выключэннем СССР, які разарваў з ім дыпламатычныя адносіны вясной 1943 г., і Часовы ўрад, прызнаны СССР) абмяркоўвалася на Ялцінскай канферэнцыі лідарамі «Вялікай тройкі». На ёй было прынята рашэнне аб рэарганізацыі Часовага ўрада «на больш шырокай дэмакратычнай аснове з уключэннем у яго дэмакратычных дзеячаў з самой Польшчы і палякаў з-за мяжы» (гл.: Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. Т. 4. Крымская конференция руководителей трех союзных держав – СССР, США и Великобритании (4–11 февраля 1945 г.) : сб. док. М. : Изд-во полит. лит., 1979. С. 279). У выніку ў чэрвені 1945 г. быў створаны Часовы ўрад нацыянальнага адзінства, які ўжо ў ліпені таго ж года атрымаў міжнароднае прызнанне.

[6] *Śląski J.* Żołnierze wyklęci. Warszawa : Rytm, 1996. 276 s.

антыкамуністычнага падполля, у той час як паняцце «нязломленыя салдаты» падкрэслівае нязломную волю, актыўнасць, супрацьстаянне навязанай сацыялістычнай сістэме, барацьбу ў неспрыяльных умовах[7].

Такім чынам, з пачатку 1990-х гг. у Польшчы адбываецца працэс гераізацыі і мемарыялізацыі АК і арганізацый, якія ўзніклі пасля яе роспуску. Гэта можна назіраць па тым, што з'яўляюцца прысвечаныя іх дзейнасці месцы памяці, яны ўшаноўваюцца ў дзяржаўных святах, польскіх выданнях для школ і навукова-папулярнай літаратуры. Так, напрыклад, у праграме 2017 г. па гісторыі для сярэдніх школ адзначаецца, што пры вывучэнні тэмы «Пачаткі камунізму ў Польшчы» вучні павінны «характарызаваць пазіцыю палякаў у дачыненні да новай улады з асаблівым акцэнтам на ўзброеным супраціве (нязломленыя [праклятыя] салдаты)»[8].

Пасляваенны польскі ўзброены супраціў не быў маналітным. Яго прадстаўлялі розныя арганізацыі, сярод якіх на тэрыторыі Беласточчыны дзейнічалі Грамадзянская краёвая армія і Нацыянальнае ваеннае аб'яднанне (НВА)[9]. Гэта былі добра арганізаваныя фарміраванні, якія мелі разгалінаваную агентурную сетку, а з вясны 1945 г. – добра ўзброеныя атрады [10, s. 49]. Узброенае падполле прадстаўляла розныя палітычныя сілы, якія сыходзіліся ў непрыманні новай улады і ўсходняй мяжы, якая прайшла па лініі Керзана. Дадатковым фактарам у гэтым пытанні стала падпісанне Пагаднення аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР паміж Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення і ўрадам БССР у верасні 1944 г.[10] Яно прадугледжвала добраахвотную «эвакуацыю» палякаў і яўрэяў, якія пражывалі ў заходніх абласцях БССР і мелі да 17 верасня 1939 г. польскае грамадзянства, на тэрыторыю Польшчы і, адпаведна, беларусаў з Польшчы ў БССР.

Дзеянне дадзенага пагаднення непасрэдным чынам датычылася беларусаў Польшчы, якія пражывалі ва ўсходняй частцы Бельскага, Беластоцкага і Сакольскага паветаў Беластоцкага ваяводства. Па ацэнках даследчыкаў, іх колькасць складала 130–150 тыс. чалавек [11, s. 40; 12, c. 177].

Польскі ўрад быў зацікаўлены ў пазбаўленні ад нацыянальных меншасцей, якія, як лічылася, у міжваенны перыяд паспрыялі аслабленню дзяржавы. Асноўную пагрозу палякі бачылі ў немцах і ўкраінцах. Што датычыцца беларусаў, то ўлады разлічвалі на іх хуткую асіміляцыю і ўліванне ў польскае асяроддзе. Тым не менш у канцы 1944 г. адміністрацыя пачала аказваць эканамічны і нацыянальны ціск на беларусаў, фактычна прымушаючы іх выязджаць у БССР. Беларусаў пазбаўлялі права прымаць удзел у аграрнай рэформе і атрымліваць зямельныя надзелы, потым для іх павысілі падаткі і колькасць абавязковых паставак дзяржаве[11], пачалі закрываць беларускія школы.

Польскае ўзброенае падполле, якое дзейнічала на Беласточчыне, таксама бачыла пасляваенную Польшчу монаэтнічнай дзяржавай. Беларусаў абвінавачвалі ў падтрымцы новага ўрада[12], супрацоўніцтве з савецкімі органамі ўлады ў 1939–1941 гг., сувязях з савецкімі партызанамі (якія лічыліся ворагамі польскага падполля ў гады Другой сусветнай вайны), варожым стаўленні да палякаў і г. д. Такім чынам, у галоўным пытанні – пазбаўленні ад беларусаў – пазіцыі польскіх улад і ўзброеных падпольных фарміраванняў супадалі. Аднак метады дасягнення гэтай мэты былі абсалютна рознымі. Калі ўлады дзейнічалі легальнымі сродкамі, то польскае падполле запалохвала, рабавала, забівала беларусаў, паліла вёскі [11, s. 44–46; 12, c. 197–203]. Найбольшую вядомасць у гэтым атрымаў атрад пад камандаваннем капітана Р. Райса. У студзені – лютым 1946 г. ён спаліў некалькі беларускіх вёсак і забіў 79 беларусаў у ваколіцах Гайнаўкі[13].

Польскія ўлады змагаліся з узброеным падполлем і асуджалі яго антыўрадавую дзейнасць. Беларусаў яны ўспрымалі як польскіх грамадзян, а таму ў публічных выказваннях і публікацыях на працягу ўсяго

[7]Wyklęci czy niezłomni? Różnicę tłumaczy dyrektor Muzeum Wojska Polskiego // Polskie Radio [Electronic resource]. URL: https://www.polskieradio.pl/7/473/Artykul/1733831,Wykleci-czy-niezlomni-Roznice-tlumaczy-dyrektor-Muzeum-Wojska-Polskiego (date of access: 26.07.2020).

[8]Podstawa programowa kształcenia ogólnego z komentarzem. Szkoła podstawowa. Historia [Electronic resource]. 2017. S. 21. URL: https://www.ore.edu.pl/wp-content/uploads/2017/05/historia.-pp-z-komentarzem.-szkola-podstawowa-1.pdf (date of access: 28.07.2018).

[9]У НВА ўвайшлі атрады Нацыянальнай ваеннай арганізацыі і Нацыянальных узброеных сіл. Частка груп, сфарміраваных пасля роспуску АК, прыбыла з Віленшчыны.

[10]Гл.: Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т. 8. Январь 1944 г. – декабрь 1945 г. М. : Наука, 1974. С. 213–219. (Падобныя пагадненні былі падпісаны Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення з урадамі Украінскай і Літоўскай ССР).

[11]Гэта супярэчыла міждзяржаўным дамоўленасцям, у адпаведнасці з якімі перасяленцы вызваляліся ад выплаты нядоімкаў па натуральных пастаўках, грашовых падаткаў, страхавых плацяжоў (гл.: Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т. 8. Январь 1944 г. – декабрь 1945 г. М. : Наука, 1974. С. 213–219).

[12]Ва ўсходніх раёнах Беластоцкага ваяводства пераважна беларусы былі членамі Польскай рабочай партыі і працавалі ва ўстановах Міністэрства публічнай бяспекі (аналаг савецкага Народнага камісарыята дзяржаўнай бяспекі і Міністэрства дзяржаўнай бяспекі) [11, s. 40].

[13]Па інфармацыі савецкага боку, за перыяд з восені 1944 па лета 1946 г. (час абмену насельніцтвам) было забіта 500 беларусаў, якія зарэгістраваліся на выезд у БССР, абрабавана звыш 1 тыс. гаспадарак [12, c. 202]. Даныя аб тым, колькі беларусаў, якія вырашылі застацца ў Польшчы, пацярпелі ад рук узброенага падполля і звычайных бандаў, невядомыя.

сацыялістычнага перыяду не падкрэслівалі іх нацыянальнасць. Спробы беларусаў арганізаваць самаахову ад нападаў узброеных фарміраванняў і звычайных бандытаў з суседніх польскіх вёсак не знаходзілі падтрымкі з боку мясцовай улады. Сітуацыя крыху змянілася пасля стварэння вясной 1946 г. добраахвотных атрадаў грамадзянскай міліцыі, у якія беларусы ўступалі, для таго каб легальна мець зброю для абароны сваёй мясцовасці [11, s. 64].

У 1948 г. спецслужбы арыштавалі Р. Райса, а ў 1949 г. яму быў вынесены смяротны прысуд. Аднак 23 лютага 1991 г. Польскі сейм прыняў закон аб прызнанні несапраўднымі прысудаў, вынесеных у дачыненні да рэпрэсіраваных асоб за іх дзейнасць у імя незалежнасці польскай дзяржавы[14]. Фактычна ўсе «праклятыя салдаты», якія змагаліся з пракамуністычнай і прасавецкай уладай, атрымалі «індульгенцыю», іх дзейнасць прызнавалася справядлівай. Але ўзнікае пытанне пра тое, якім чынам у сучаснай палітыцы памяці Польшчы ўспрымаецца дзейнасць атрада Бурага ў дачыненні да беларускага насельніцтва ў першыя пасляваенныя гады.

У пачатку 1990-х гг. сын Р. Райса пры падтрымцы Сусветнага саюза салдат Арміі краёвай паспрабаваў дабіцца рэабілітацыі свайго бацькі і атрымання кампенсацыі. Вынікам яго стараннеяў стала тое, што ў 1995 г. Р. Райс быў рэабілітаваны судом Варшаўскай ваеннай акругі на падставе закона 1991 г. аб прызнанні несапраўднымі прысудаў за дзейнасць у імя незалежнасці Польшчы. Аргументам на карысць Р. Райса было прызнана тое, што ён кіраваўся вышэйшымі інтарэсамі (незалежнасць польскай дзяржавы), а таму не заўсёды яго дзейнасць была этычнай[15].

Нягледзячы на рашэнне суда, факт забойства атрадам пад камандаваннем Р. Райса беларусаў – польскіх грамадзян у студзені – лютым 1946 г. застаецца фактам, пазіцыю ў дачыненні да якога павінны былі выказаць польскія ўлады і кампетэнтныя органы. У 1995 г. у Беластоцкую акруговую камісію расследавання злачынстваў супраць польскага народа ІНП быў накіраваны зварот ад імя Грамадскага камітэта па эксгумацыі астанкаў асоб, забітых каля в. Старыя Пухалы. Гэта стала падставай для правядзення адмысловага расследавання. У 1997 г. следства было прыпынена ў сувязі з ліквідацыяй камісіі, аднак праз пяць гадоў яго аднавілі, бо справу кваліфікавалі як дзеянні супраць чалавечнасці (генацыд), па якіх няма тэрміну даўнасці[16].

Следства выявіла, што 26 студзеня 1946 г. атрад Р. Райса спыніўся ў в. Аўгустынцы. Перад адыходам з яе былі расстраляны солтыс і адзін з жыхароў (быццам бы за супрацоўніцтва са службай бяспекі, хаця гэта ніколі не было даказана). Раніцай наступнага дня атрад узяў у палон у лесе пад Гайнаўкай 40 фурманаў, якія па распараджэнні мясцовых улад адправіліся, каб вывезці дрэвы з лесу. Людзі і гужавы транспарт былі выкарыстаны байцамі Р. Райса як сродак перамяшчэння.

Пазней, 29 студзеня, атрад Бурага зайшоў у в. Залешаны, якую было вырашана спаліць. Р. Райс загадаў сабраць жыхароў у хаце Дзмітра Сахарчука на сход. Тых, хто не захацеў ісці, прывялі пад пагрозай расстрэлу. Людзям не дазвалялі выходзіць з хаты. Потым былі выведзены 16-гадовы сын солтыса Пётр Дзем'янюк (яго бацьку не змаглі знайсці ў вёсцы) і адзін з жыхароў суседняй в. Сухавольцы Аляксандр Зелінко, якіх расстралялі на панадворку. Пасля гэтага ў хату зайшоў Р. Райс, які загадаў палякам выйсці, а астатнім паведаміў, што вёска і людзі будуць знішчаны. Выйшаўшы, ён замкнуў дзверы. У бок хаты пачалі страляць з кулямёта, ад чаго загарэлася саламяная страха. Па людзях, якія спрабавалі збегчы, адкрылі агонь. Пасля гэтага падпалілі вясковыя хаты. У выніку апісаных дзеянняў загінулі 14 чалавек (у тым ліку сямёра дзяцей), двое былі цяжка паранены, адзін вясковец моцна абгарэў. У той самы дзень былі спалены некалькі забудоў у вёсках Вулка Выганоўская, Сухавольцы, Сакі і Мостэк. У першай з іх былі забіты два чалавекі[17].

Атрад Р. Райса 31 студзеня затрымаўся ў в. Старыя Пухалы. Тут сярод 40 фурманаў былі выбраны 30 праваслаўных, якіх расстралялі ў бліжэйшым лесе. Каталікоў адпусцілі дадому[18]. Забітых закапалі на бульбяным полі і прыкрылі галінамі. Узрост расстраляных склаў ад 17 да 56 гадоў. Эксгумацыя цел паказала, што фурманаў застрэлілі, а іх «чарапы былі разбіты». Адзін са сведкаў здарэння расказваў, што на загад Р. Райса твары людзей раздрабілі абухамі сякер. Гэта пацвердзіў і эксперт, які заявіў, што галовы

[14]Ustawa z dnia 23 lutego 1991 r. o uznaniu za nieważne orzeczeń wydanych wobec osób represjonowanych za działalność na rzecz niepodległego bytu Państwa Polskiego // Dziennik Ustaw [Electronic resource]. 1991. Nr 31. Poz. 149. URL: http://isap.sejm.gov.pl/isap.nsf/download.xsp/WDU19910340149/O/D19910149.pdf (date of access: 26.07.2020).

[15]Informacja o ustaleniach końcowych śledztwa S 28/02/Zi w sprawie pozbawienia życia 79 osób – mieszkańców powiatu Bielsk Podlaski, w tym 30 osób tzw. furmanów, w lesie koło Puchał Starych, dokonanego w okresie od dnia 29 stycznia 1946 r. do dnia 2 lutego 1946 r. [Electronic resource]. URL: https://ipn.gov.pl/pl/dla-mediow/komunikaty/9989,Informacja-o-ustaleniach-koncowych-sledztwa-S-2802Zi-w-sprawie-pozbawienia-zycia.html (date of access: 05.10.2018).

[16]Ibid.

[17]Ibid.

[18]*Kowalik H.* Pokaż jak się żegnasz. Mimo upływu 60 lat nadal trwa sąd nad «Burym» za pacyfikacje białoruskich wsi na Podlasiu // Wprost. Historia [Electronic resource]. 2015. 12 list. URL: https://historia.wprost.pl/reportaze-sadowe/524217/pokaz-jak-sie-zegnasz.html (date of access: 26.07.2020).

былі разбіты тупымі, круглымі і паўкруглымі прадметамі[19].

На наступны дзень, 1 лютага, атрад Бурага затрымаўся ў в. Лубіцэ, адкуль накіраваліся групы для пацыфікацыі суседніх вёсак. Былі спалены вёскі Шпакі, Зань, Канцавізна каля Суража. У Шпаках расстралялі сем чалавек, чацвярых паранілі (двое з іх памерлі ў шпіталі), адну жанчыну згвалтавалі, спалілі 22 забудовы, у тым ліку 17 хат. У в. Зань загінула па розных даных ад 24 да 30 чалавек (у тым ліку 9 дзяцей), ад 8 да 15 асоб былі паранены (адна з іх пазней памерла), 21 забудову спалілі. Пры гэтым расследаванне паказала, што дамы каталікоў, як і дамы праваслаўных, што стаялі блізка да іх, не падпальвалі. У бок тых, хто спрабаваў ратавацца, адкрылі агонь. У в. Канцавізне ахвяр сярод насельніцтва не было, бо людзі паспелі збегчы, калі пачалі падпальваць хаты і страляць. У выніку падпалу атрад Р. Райса знішчыў 3 хаты, 24 хлявы і 12 іншых гаспадарчых забудоў [5, с. 51–53][20].

Вывучыўшы дакументы і паказанні 169 сведкаў[21], следства прыйшло да высновы, што дзейнасць атрада Бурага мела прыкметы генацыду, бо людзі (польскія грамадзяне) былі забіты па прычыне іх беларускай нацыянальнасці. У выснове дакладна акрэслена, што адказнасць за здзейсненае нясе Р. Райс, які аддаваў загады аб знішчэнні вёсак, забойстве беларускіх фурманаў і мірных жыхароў. Яго дзеянні нельга растлумачыць дзяржаўнымі інтарэсамі. Больш за тое, яны спрыялі росту папулярнасці камуністычнай улады ў Польшчы і падрывалі аўтарытэт падпольных арганізацый.

Следства было закрыта 30 чэрвеня 2005 г. з-за сканчэння тэрміну даўнасці па прычыне смерці выканаўцаў і адсутнасці магчымасці высветліць іх асобы[22]. Гэта рашэнне было абскарджана чатырма асобамі (з 80 чалавек, якіх прызналі пацярпелымі), тым не менш акругова суд Беластока ў лістападзе 2005 г. пакінуў рашэнне ў сіле. Гэта аргументавалася тым, што следства было праведзена добрасумленна, а большасці выканаўцаў яшчэ ў канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. быў вынесены смяротны прысуд, частка з іх загінула ў баях. Суд адзначыў, што рашэнні аб забойствах прымаліся асабіста Р. Райсам, а таму адказнасць не можа пашырацца на ўсю арганізацыю – Нацыянальныя ўзброеныя сілы, у складзе якіх ён ваяваў.

Нягледзячы на вынікі следства і яго высновы, шэраг кансерватыўных польскіх палітычных і грамадскіх дзеячаў і гісторыкаў выступілі ў абарону Р. Райса. Яны тлумачылі яго ўчынкі тым, што беларусы падтрымлівалі камуністаў у міжваенны перыяд, у верасні 1939 г. віталі Чырвоную армію, прымалі актыўны ўдзел у сацыялістычных пераўтварэннях 1939–1941 гг., выдавалі палякаў органам НКУС, дапамагалі складаць спісы на вываз палякаў у Сібір і г. д. Такім чынам, на думку абаронцаў Р. Райса, беларусы «заслужылі» такое стаўленне да сябе. Дадатковым абвінавачаннем лічыцца тое, што беларусы звярталіся да савецкага кіраўніцтва з просьбамі перадаць БССР частку тэрыторыі Бельскага павета Польшчы. У пасляваенных умовах, калі палякі лічылі (а некаторыя і цяпер лічаць), што ў іх адабралі ўсходнія землі, гэта ўспрымалася як двайная здрада. У віну беларусам ставяць і тое, што яны падтрымлівалі пасляваенную ўладу ў Польшчы і супрацоўнічалі са спецслужбамі. У сувязі з гэтым у апраўданне Р. Райса сцвярджаецца, што падполле змагалася са спецслужбамі, а не з беларусамі як такімі. Быццам бы ў асноўным падполле дасылала апошнім лісты з пагрозамі або, «у выключных выпадках», расстрэльвала асобных людзей, каб запалохаць такім чынам вёску і прымусіць жыхароў выехаць з Польшчы.

Пра высокае прызнанне дзейнасці і заслуг капітана Р. Райса ў Польшчы сведчыць і тое, што яго імя было згадана ў экспазіцыі Музея гісторыі Другой сусветнай вайны. Праўда, такое рашэнне кіраўніцтва музея падверглася моцнай крытыцы ліберальных колаў [9, s. 224].

З канца 1980-х гг. імя Р. Райса прама ці ўскосна фігуруе ў публічнай прасторы Беласточчыны. Так, у 1989 г. на Доме кіно ў Беластоку, дзе ў 1949 г. адбываўся судовы працэс над Бурым, з'явілася памятная дошка з надпісам: «У гэтым будынку пасля вайны выносілі смяротны прысуд салдатам Падпольнай Польшчы» (над надпісам змяшчаюцца выява арла ў кароне і каталіцкі крыж, вакол арла – абрэвіятура АК). У 1999 г. у горадзе адбылася спецыяльная выстава, да якой быў выдадзены альбом «Праклятыя салдаты. Антыкамуністычнае ўзброенае падполле пасля 1944 г.». Пад фотаздымкам Р. Райса быў змешчаны каментарый: «Спаленне… вёсак было акцыяй у адказ на тое, што фурманаў злавілі ў пушчы

[19]Śledztwa S 28/02/Zi… (У дакуменце такія сведчанні пра расстрэл ставяцца пад сумненне. Як больш верагодныя падаюцца сведчанні членаў атрада Р. Райса, якія заяўлялі, што не ведалі прычын расстрэлу фурманаў. Такі падыход следчых выклікае здзіўленне, бо прыведзенае ў гэтым жа дакуменце заключэнне эксперта фактычна пацвярджае словы сведкаў-беларусаў. Пры гэтым акцэнт робіцца на тым, што спачатку фурманы былі расстраляны, а ўжо потым, магчыма, іх целы знявечылі.)

[20]Ibid.

[21]Сярод сведкаў былі 15 байцоў з атрада Р. Райса, з якіх ніхто не прызнаўся ў забойстве фурманаў (гл.: *Kowalik H.* Pokaż jak się żegnasz. Mimo upływu 60 lat nadal trwa sąd nad «Burym» za pacyfikacje białoruskich wsi na Podlasiu // Wprost. Historia [Electronic resource]. URL: https://historia.wprost.pl/reportaze-sadowe/524217/pokaz-jak-sie-zegnasz.html (date of access: 26.07.2020)).

[22]Informacja o ustaleniach końcowych…

падчас нелегальнай вырубкі дрэў»[23]. Уступ да альбома напісаў прэм'ер-міністр Е. Бузэк.

Інфармацыя пра Р. Райса і яго паплечнікаў рэгулярна з'яўлялася на прысвечаных «праклятым салдатам» выставах, арганізаваных Беластоцкім аддзяленнем ІНП, мэта якіх – выхоўваць у маладога пакалення палякаў патрыятызм і пачуццё гонару за сваё мінулае.

З 2011 г. у Польшчы 1 сакавіка адзначаецца дзяржаўнае свята – Нацыянальны дзень памяці «праклятых салдат» (не з'яўляецца афіцыйным выхадным днём), калі ўзгадваюцца тыя, хто змагаўся з фашызмам і таталітарызмам (маецца на ўвазе савецкі варыянт) і абараняў сваю радзіму. У шэрагу польскіх гарадоў з гэтай нагоды сталі праводзіць шэсці (з-за наяўнасці элементаў інсцэнізацыі іх яшчэ называюць маршам «праклятых салдат»). Таксама ў Польшчы 2013 г. быў аб'яўлены Годам «праклятых салдат».

Найбольшую актыўнасць у арганізацыі такіх маршаў праяўляе Нацыянальна-радыкальны лагер (НРЛ), які, паводле кіраўнікоў, бярэ вытокі з аднайменнай групоўкі, што ўзнікла ў Польшчы ў 1934 г. Для абедзвюх арганізацый характэрны нацыяналізм, антысемітызм, клерыкалізм. На інтэрнэт-старонцы аб'яднання адзначаецца, што гэта таварыства маладых людзей, якім «блізкія такія каштоўнасці, як Бог, Гонар, Айчына, Сям'я, Традыцыя і Сяброўства». Сцвярджаецца, што ў сучаснай Польшчы прыходзіць новае пакаленне, якое прывядзе краіну да адраджэння[24]. Акрамя таго, прадстаўнікі гэтай арганізацыі нясуць пасыл, згодна з якім грамадства заўсёды павінна памятаць, што змена ўсходняй мяжы пасля Другой сусветнай вайны стала вынікам «камуністычнага злачынства»[25].

У 2016 г. НРЛ правёў першы марш «праклятых салдат» у Гайнаўцы. Спачатку было заяўлена, што ён пройдзе пад патранатам прэзідэнта Польшчы А. Дуды. Аднак у апошні момант, пасля таго як у СМІ сталі пісаць, што для мясцовых беларусаў гэты марш з'яўляецца пляўком у душу, бо іх блізкія былі забіты атрадам Р. Райса, адміністрацыя прэзідэнта заявіла, што ніякага патранату не будзе (і быццам бы і не планавалася)[26].

Пасля гэтага маршы польскіх нацыяналістаў у Гайнаўцы адбываюцца штогод (пры ціхай, негалоснай падтрымцы мясцовых улад). Падчас шэсця заўсёды становіцца згадваецца Р. Райс. Двойчы мясцовыя ўлады спрабавалі забараніць марш і двойчы суд палічыў гэта рашэнне незаконным[27].

Падчас маршаў назіраюцца спрэчкі з мясцовым насельніцтвам, якое арганізоўвае контракцыю па шляху руху калоны. Жыхары кажуць, што не выступаюць супраць «праклятых салдат», якіх лічаць героямі, аднак падкрэсліваюць, што тыя, хто забіваў тут людзей па нацыянальна-рэлігійнай прыкмеце, героямі не з'яўляюцца. Для радыкальных сіл такая пазіцыя раўназначная здрадзе. Пра гэта сведчаць хаця б лозунгі, якія гучаць на маршах: «Буры – наш герой», «Раз серпам, раз молатам у чырвоную галыцьбу»[28], «Смерць ворагам Айчыны», «На дрэвах замест лісцеў будуць вісець камуністы», «Нацыянальная Гайнаўка» і інш. Падчас канфліктаў удзельнікі маршаў прапануюць незадаволеным іх правядзеннем ехаць у Беларусь, задаюць апанентам пытанне, чаму тыя не выехалі з Польшчы раней, сцвярджаюць, што гэта польская зямля і дзяржава, дзе ўсе пытанні павінны вырашаць толькі палякі і г. д. У падтрымку сваёй пазіцыі польскія правыя здымаюць фільмы, вядуць прапагандысцкую работу, у якой выкарыстоўваюць польскіх парламентарыяў. Сярод кантраверсійных фільмаў можна назваць работу Е. Шакаліцкай «Двойчы быў пракляты» (2017), якая атрымала тры ўзнагароды на IX кінафестывалі «Непакорныя, нязломленыя, праклятыя», што праходзіў пад патранатам прэзідэнта Польшчы А. Дуды (Гдыня, 27–30 верасня 2017 г.)[29]. У Беластоку паказ стужкі быў арганізаваны мясцовым аддзяленнем ІНП[30].

---

[23] *Kowalik H.* Pokaż jak się żegnasz. Mimo upływu 60 lat… (Прычына забойства беларусаў у гэтым выпадку вызначана памылкова. Яны былі накіраваны мясцовымі ўладамі для вывазу драўніны з лесу. Аднак сам факт такога запісу сведчыць пра спробы маніпуляцыі калектыўнай памяццю. Больш падрабязна пра стратэгіі фарміравання памяці гл. [8, s. 86–88]).

[24] Obóz Narodowo-Radykalny [Electronic resource]. URL: https://www.onr.com.pl/czym-jest-onr/ (date of access: 06.10.2018).

[25] Polska Jutra. Deklaracja Ideowa Obozu Narodowo-Radykalnego [Electronic resource]. URL: https://www.onr.com.pl/deklaracja-ideowa/ (date of access: 06.10.2018).

[26] *Celej P.* Ludobójca czy patriota – kim był Romuald Rajs «Bury» z plakatu marszu, któremu miał patronować prezydent Duda? [Electronic resource]. URL: https://natemat.pl/171467,ludobojca-czy-patriota-kim-byl-romuald-rajs-bury-z-plakatu-marszu-pod-patronatem-prezydenta-dudy# (date of access: 06.10.2018) ; *Gaafar A.* Andrzej Duda miał objąć patronatem marsz ONR, ale… skasował wpis i wszystkiego się wypiera [Electronic resource]. URL: https://natemat.pl/171483,andrzej-duda-objal-patronatem-marsz-onr-po-czym-skasowal-wpis-i-wszystkiego-sie-wypiera (date of access: 26.07.2020).

[27] *Wieczeryńska S., Fiłończuk R.* W Zaleszanach upamiętniono ofiary pacyfikacji wsi w styczniu 1946 r. // Portal Historyczny [Electronic resource]. URL: https://dzieje.pl/aktualnosci/w-zaleszanach-upamietniono-ofiary-pacyfikacji-wsi-w-styczniu-1946-r (date of access: 26.07.2020) ; *Iwaniuk J.* Radni Hajnówki przeciwko upamiętnianiu «Burego» podczas marszu // Polskie Radio Białystok [Electronic resource]. URL: https://www.radio.bialystok.pl/wiadomosci/index/id/179660 (date of access: 26.07.2020).

[28] У такіх выказваннях праяўляецца ўкаранёнае ў Польшчы меркаванне, што тыя, хто падтрымліваў камуністаў, прадстаўлялі найбяднейшыя слаі грамадства, а да такіх, без сумнення, належалі беларусы Падляшша (і ў больш шырокім сэнсе Заходняй Беларусі).

[29] Nagrody IX Festiwalu Filmowego Niepokorni Niezłomni Wyklęci zostały przyznane. Gdynia, 27–30 września 2017 [Electronic resource]. URL: https://gdansk.ipn.gov.pl/pl2/aktualnosci/42039,Nagrody-IX-Festiwalu-Filmowego-Niepokorni-Niezlomni-Wykleci-zostaly-przyznane-Gd.html (date of access: 26.07.2020).

[30] Pokaz autorski filmu «Podwójnie wyklęty» z udziałem reżyser Ewy Szakalickiej. Białystok, 10 marca 2018 [Electronic resource]. URL: https://bialystok.ipn.gov.pl/pl1/aktualnosci/48367,Pokaz-autorski-filmu-Podwojnie-wyklety-z-udzialem-rezyser-Ewy-Szakalickiej-Bialy.html (date of access: 26.07.2020).

У 2016 г. быў выдадзены адкрыты ліст нашчадкаў Р. Райса, прадстаўнікоў Саюза салдат НВА, гісторыкаў, дзеячаў культуры «ў абарону памяці і гонару камандуючага 3-й Віленскай брыгадай Нацыянальнага ваеннага аб’яднання» капітана Рамуальда Райса Бурага. У звароце адзначаецца, што Р. Райс вёў барацьбу ў межах «агульнапольскага антыкамуністычнага паўстання», на супрацьлеглым баку якога былі забітыя ім жыхары вёсак Залешаны, Вулка Выганоўская, Зань і Шпакі. У якасці абгрунтавання справядлівасці дзеянняў Бурага прыводзіцца наступная інфармацыя: «У незалежнай Польшчы яны (забітыя жыхары згаданых вёсак. – *Л. К.*) былі дзеячамі і супрацоўнікамі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, якія заяўлялі пра жаданне адарваць Падляшша і Беласточчыну ад Айчыны-маці, каб далучыць польскія землі да Савецкага Саюза. Падчас савецкай акупацыі гэтыя ж самыя людзі былі супрацоўнікамі савецкай ваеннай разведкі Смерш і НКУС, якія праследавалі “ворагаў савецкай улады”. 19 красавіка 1945 г. прызначаны Саветамі беластоцкі ваявода выдаў распараджэнне аб стварэнні Вясковай службы парадку… якая мела агнястрэльную зброю, каб страляць у бок Бурага і яго салдат. Былыя дзеячы КПЗБ станавіліся ўзброенымі савецкімі калабарантамі, якія палявалі на салдат незалежніцкага падполля, каб выдаць іх у рукі камуністычных улад. У гэтым сэнсе акцыя Бурага мела абарончы характар, бо забівалі даносчыкаў, гатовых выдаць на смяротны прысуд звыш 200 салдат 3-й Віленскай брыгады НВА. Дзеянні капітана Бурага знаходзяцца ў этычных межах…»[31] Смерць жанчын і дзяцей аўтары ліста спісвалі на пабочны эфект барацьбы ці дзеянні асобных салдат.

Як бачым, у сучаснай Польшчы дзеянні Р. Райса ацэньваюцца не з пункта гледжання маралі і гуманістычных каштоўнасцей, а з пазіцый палітычных інтарэсаў дзяржавы, як іх бачаць пэўныя групы. Гэта сведчыць пра тое, што дыскусія выходзіць за межы гістарычнай навукі, дзе, як сцвярджае польскі даследчык прафесар Беластоцкага ўніверсітэта Э. Мірановіч, Р. Райс і яго падначаленыя выступаюць злачынцамі, а не нацыянальнымі героямі[32]. Такім чынам, нягледзячы на добравядомыя факты, задачы антыкамуністычнай гістарычнай палітыкі даюць маральнае права для гераізацыі ўсіх, хто змагаўся з прасавецкай уладай у Польшчы. А гэта вядзе да рэлятывізацыі такой фундаментальнай агульначалавечай каштоўнасці, як права на жыццё.

Яшчэ адным сведчаннем гераізацыі Р. Райса з’яўляецца згадванне яго імя на адкрытым у 2018 г. у гміне Пасвентне помніку. Надпіс на ім гучыць наступным чынам: «У гонар салдат 3-й Віленскай брыгады Нацыянальнага ваеннага аб’яднання капітана Рамуальда Райса Бурага, падпаручніка Казімежа Хмялёўскага Рэкіна 6-й Віленскай брыгады Арміі краёвай, падпаручніка Люцыяна Мінкевіча Віктара, падпаручніка Уладыслава Лукасіка Млота, якія 28 красавіка 1946 г. пад Бжаховымі Музыламі перамаглі ў баі з аперацыйнай групай УБ, ГМ і КУБ[33]. Удзячныя крэўныя». Ва ўрачыстасці адкрыцця помніка прымалі ўдзел прадстаўнікі органаў мясцовага самакіравання, віцэ-ваявода Палескага ваяводства, дэпутат ад партыі «Права і справядлівасць» Д. Піянткоўскі і каталіцкія святары. Аднак у хуткім часе хтосьці напісаў на ім «забойцы» і закрэсліў імя Р. Райса[34].

Здавалася б, у сітуацыі, калі дзеянні Р. Райса на Беласточчыне ў студзені – лютым 1946 г. атрымалі адназначную ацэнку следства, ІНП павінен прытрымлівацца як мінімум нейтральнай пазіцыі ў дачыненні да мерапрыемстваў, дзе згадваецца яго імя. Аднак тут умешваецца палітыка.

Прадстаўнікі партыі «Права і справядлівасць», якія прыйшлі да ўлады ў 2005 г., выразна заявілі пра неабходнасць пераацэнкі падзей гісторыі і стварэнне новага наратыву. Аднак толькі з 2015 г., калі партыя перамагла на парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбарах і сканцэнтравала ўладу ў сваіх руках, гэтыя ідэі пачалі ўвасабляцца ў жыццё. Падчас інаўгурацыйнай прамовы прэзідэнт А. Дуда зазначыў, што сучасная Польшча «часта патрабуе абароны, патрабуе абароны яе добрага імя», а таму існуе неабходнасць правядзення актыўнай гістарычнай палітыкі як унутры краіны, так і за яе межамі: «Мы, палякі, маем вялікую гісторыю… якой павінны ганарыцца. Мы павінны гаварыць праўду, а таксама мы павінны змагацца за праўду ў адносінах з нашы-

[31]Grupa naukowców, dziennikarzy i działaczy społecznych wystosowała list w obronie dobrego imienia kapitana Romualda Rajsa pseudonim «Bury» [Electronic resource]. URL: https://kresy.pl/wydarzenia/list-otwarty-w-obronie-kapitana-burego/ (date of access: 26.07.2020). (Праведзенае ІНП следства, як і сучасныя навуковыя даследаванні, паказвае, што ў вясковых жыхароў не было зброі для аказання супраціву, а калі яна і з’явілася, то пасля падзей, якія апісваюцца ў звароце [13]. Гл. таксама: Informacja o ustaleniach końcowych…)

[32]Dla Białorusinów «Bury» to symbol okrucieństwa i zbrodni. Z prof. Eugeniuszem Mironowiczem, historykiem z Uniwersytetu w Białymstoku, rozmawia Przemysław Prekiel [Electronic resource]. URL: https://wolnemedia.net/dla-bialorusinow-bury-to-symbol-okrucienstwa-i-zbrodni/ (date of access: 05.10.2018).

[33]Упраўленне бяспекі, грамадзянская міліцыя, корпус унутранай бяспекі, з дапамогай якіх адбывалася ўсталяванне пракамуністычнай улады ў Польшчы і вялася барацьба з узброеным падполлем.

[34]*Chłodowski M.* «Bury» bohaterem pomnika w Poświętnem. Komentarze: «Bandycie stawiają pomnik» // Gazeta Wyborcza [Electronic resource]. 2018. 26 lip. URL: https://bialystok.wyborcza.pl/bialystok/7,35241,23719343,bury-bohaterem-pomnika-w-poswietnem-komentarze-bandycie.html (date of access: 26.07.2020) ; Poświętne. Pomnik żołnierzy wyklętych zdewastowany. Zamazany Bury. Policja już prowadzi dochodzenie // Kurjer Poranny [Electronic resource]. 2018. 3 sierp. URL: https://poranny.pl/poswietne-pomnik-zolnierzy-wykletych-zdewastowany-zamazany-bury-policja-juz-prowadzi-dochodzenie/ar/13387960 (date of access: 27.07.2020).

мі суседзямі…»[35] Ацэньваючы словы прэзідэнта А. Дуды, трэба ўлічваць, што ў барацьбе за электарат партыя «Права і справядлівасць» часта прыбягае да антыкамуністычнай і нацыяналістычнай рыторыкі, а таму і гісторыю свайго народа і краіны разглядае менавіта з такой пазіцыі. Пра гэта сведчыць і выступленне прэзідэнта на сустрэчы з прадстаўнікамі навуковай супольнасці ў лістападзе 2015 г., падчас якой абмяркоўваліся пытанні распрацоўкі стратэгіі польскай гістарычнай палітыкі. На ёй А. Дуда заявіў пра неабходнасць «паказаць гісторыю так, як у дадзены момант будзе найбольш карысным з палітычнага пункта гледжання для нашай краіны. Нашай задачай з'яўляецца фарміраванне патрыятызму палякаў, мы павінны фарміраваць грамадзянскую пазіцыю»[36].

Задачу па рэалізацыі такога варыянта гістарычнай палітыкі выконвае ІНП, частка супрацоўнікаў якога з 2015 г. актыўна ўдзельнічаюць у палітычным жыцці краіны, праводзячы кансерватыўную і нацыяналістычную гістарычную палітыку ў адпаведнасці з тым, як яе разумеюць лідары кіруючай партыі[37].

Сведчаннем змен у пазіцыі ІНП, які мае найлепшыя фінансавыя і арганізацыйныя магчымасці для ўплыву на грамадства, стала выданне ў 2019 г. «Заявы ў справе інфармацыі, якая змяшчаецца ў канчатковых высновах следства S 28/02/Zi у справе забойства 79 асобаў – жыхароў павета Бельска-Падляскага, у тым ліку 30 так званых фурманаў у лесе каля Старых Пухал, якое было здзейснена ў перыяд з 29 студзеня па 2 лютага 1946 г.»[38] У дакуменце адзначаецца, што «ў святле новых навуковых даследаванняў выніковая інфармацыя следства (пра тое, што дзеянні атрада Райса былі накіраваны супраць чалавецтва і мелі прыкметы генацыду. – *Л. К.*) не адпавядае фактычным даным»[39]. У якасці абгрунтавання такога рашэння былі названы некалькі публікацый, якія выйшлі ў Польшчы ў 2016–2018 гг.[40] Іх аўтары сцвярджаюць, што Р. Райс «меў магчымасць спаліць не пяць, а значна больш беларускіх вёсак у Бельскім павеце. <…> Мы лічым, што не праваслаўнае веравызнанне і беларуская нацыянальнасць былі прычынай, па якой гэтыя людзі загінулі ад рук партызан 3-й Віленскай брыгады АК»[41]. У гэтых і іншых публікацыях фактычна абгрунтоўваецца адсутнасць прыкмет генацыду ў дзеяннях атрада Р. Райса. Ва ўсіх згаданых выданнях даказваецца, што беларусы пацярпелі за тое, што падтрымлівалі камуністычны рэжым. Аднак працы, на якія спасылаецца ІНП, атрымалі ў свой час разгромныя навуковыя рэцэнзіі з боку спецыялістаў па гісторыі руху Супраціўлення і антысавецкага падполля ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе[42].

У заяве ІНП са спасылкай на згаданы вышэй закон 1991 г. сцвярджаецца, што прызнанне прысуду несапраўдным раўназначнае зняццю ўсіх абвінавачанняў[43]. Адпаведна, паводле ІНП,

[35]Andrzej Duda w swoim pierwszm orzędziu: aktywna polityka historyczna jest potrzebna [Electronic resource]. URL: https://histmag.org/Andrzej-Duda-w-swoim-pierwszym-oredziu-aktywna-polityka-historyczna-jest-potrzebna-11612/ (date of access: 03.10.2020).

[36]Zapis spotkania inaugurującego prace nad powstaniem Strategii Polskiej Polityki Historycznej w Belwederze, 17 listopada 2015 r. S. 5 [Electronic resource]. URL: https://www.prezydent.pl/kancelaria/dzialalnosc-kancelarii/art,18,zapis-spotkania-dot-strategii-polskiej-polityki-historycznej.html (date of access: 03.10.2020).

[37]Праўда, далёка не ўсе супрацоўнікі ІНП падтрымліваюць такі варыянт гістарычнай палітыкі і адлюстравання гістарычнага мінулага.

[38]Гаворка ідзе пра следства ІНП, якое было спынена ў 2005 г.

[39]Komunikat dotyczący informacji zawartych w ustaleniach końcowych śledztwa S 28/02/Zi w sprawie pozbawienia życia 79 osób – mieszkańców powiatu Bielsk Podlaski, w tym 30 osób tzw. furmanów w lesie koło Puchał Starych, dokonanych w okresie od dnia 29 stycznia 1946 r. do dnia 2 lutego 1946 r. [Electronic resource]. URL: https://ipn.gov.pl/pl/dla-mediow/komunikaty/67471,Komunikat-dotyczacy-informacji-zawartych-w-ustaleniach-koncowych-sledztwa-S-2802.html (date of access: 26.07.2020).

[40]У дакуменце змяшчаецца пералік гэтых прац (*Krajewski K.*, *Wąsowski G.* Kapitan Romuald Rajs a Białorusini – fakty i mit // Glaukopis. Pismo społeczno-historyczne. 2016. Nr 33 ; *Krajewski K.*, *Wąsowski G.* Kpt. Romuald Rajs «Bury» na kartach książki «Skazy na pancerzach», czyli prawda według Piotra Zychowicza // Glaukopis. Pismo społeczno-historyczne. 2019. Nr 36. URL: http://podziemiezbrojne.blox.pl/resource/Bury_vs_Zychowicz.2018.pdf ; *Bechta M., Muszyński W. J.* Przeciwko Pax Sovietica. Narodowe Zjednoczenie Wojskowe i struktury polityczne Ruchu Narodowego wobec reżimu komunistycznego 1944–1956. Warszawa : IPN, 2017 ; *Ostapiuk M.* Komendant «Bury». Biografia kpt. Romualda Adama Rajsa «Burego» (1913–1949). Białystok ; Olsztyn ; Warszawa: IPN, 2019). Паказальна, што К. Краеўскі і Г. Вансовіч прадстаўляюць фонд «Памятаем», на інтэрнэт-старонцы якога пазначана, што яго асноўнай задачай з'яўляецца «вяртанне грамадскай памяці пра людзей, якія ў другой палове 40-х – пачатку 50-х гадоў мінулага стагоддзя вялі ўзброеную барацьбу супраць камунізму» (гл.: http://www.fundacjapamietamy.pl/cele-fundacji). З поглядамі і асноўнымі ідэямі М. Астапюка, які з'яўляецца супрацоўнікам ІНП, можна пазнаёміцца ў інтэрв'ю з ім (M. Ostapiuk: Tragedia w Zaleszanach nie jest chlubną kartą w życiorysie kpt. Rajsa // Portal historyczny [Electronic resource]. URL: https://dzieje.pl/aktualnosci/m-ostapiuk-tragedia-w-zaleszanach-nie-jest-chlubna-karta-w-zyciorysie-kpt-rajsa (date of access: 26.07.2020)).

[41]Цыт. па: *Chołodowski M.* IPN: «Bury» niewinny. Przedstawiciele mniejszości białoruskiej zbulwersowani // Gazeta Wyborcza [Electronic resource]. 2019. 11 marca. URL: https://bialystok.wyborcza.pl/bialystok/7,35241,24538365,ipn-bury-niewinny-przedstawiciele-mniejszosci-bialoruskiej.html (date of access: 26.07.2020).

[42]Гл., напрыклад, рэцэнзіі на кнігу М. Астапюка дырэктара Інстытута палітычных даследаванняў Польскай акадэміі навук прафесара Г. Матыкі (*Motyka G.* Książce IPN o «Burym» bliżej do «Trylogii» Sienkiewicza niż do prawdy naukowej // Gazeta Wyborcza [Electronic resource]. 2019. 20 marca. URL: https://wyborcza.pl/alehistoria/7,162654,24567164,ksiazce-ipn-o-burym-blizej-do-trylogii-sienkiewicza-niz-do.html (date of access: 26.07.2020)), супрацоўніцы Шчэцінскага аддзялення ІНП М. Семчышын (*Semczyszyn M.* Pacyfikacja pięciu wsi. O ciemnych kartach biografii kapitana Romualda Rajsa «Burego» // Kwart. historyczny. 2020. Rocz. 127, Nr 2. S. 369–396.

[43]Komunikat dotyczący informacji…

рэабілітаваны ў 1995 г. Р. Райс невінаваты ў забойстве беларусаў.

Пазіцыя інстытута выклікала вялікую дыскусію ў прэсе і абурэнне беларусаў Польшчы. У адказ на гэта выконваючы абавязкі дырэктара Бюро інфармацыі і камунікацыі з грамадствам ІНП Д. Качванска-Каліта зазначыла, што Бюро гістарычных даследаванняў пры інстытуце і Камісія па расследаванні злачынстваў супраць польскага народа працуюць незалежна адно ад аднаго. Разам з тым яны абменьваюцца інфармацыяй па меры неабходнасці. Пры гэтым «спецыфіка і мэты пракурорскага расследавання, якое рэалізуецца ў прававых межах, адрозніваюцца ад асноў і мэт даследавання навукоўцаў, якія арыентуюцца на падрыхтоўку камплементарных навуковых публікацый»[44]. Адзначалася, што меркаванне гісторыка не мае юрыдычнай сілы і можа разыходзіцца з меркаваннем следства. Атрымліваецца, што абвінавачанні ў генацыдзе з Р. Райса не здымаюцца, але яго дзейнасць у цэлым ацэньваецца станоўча.

Міністр замежных спраў Польшчы Я. Чапутовіч, каментуючы ў сейме заяву ІНП пра «памылковасць» высноў следства і абвяржэнне абвінавачання Р. Райса ў генацыдзе, зазначыў, што «існуюць розныя інтэрпрэтацыі гісторыі, якія могуць змяняцца пад уплывам новых інтэрпрэтацый, ці новых доказаў, ці новых фактаў», і прапанаваў пачакаць новых даследаванняў ІНП у гэтай справе[45].

Такім чынам, польская гістарычная палітыка пачынае вызначаць падыходы да гісторыяпісання, якое адыходзіць ад навуковых стандартаў.

Калі гаворка ідзе пра палітыку памяці ў дачыненні да дзейнасці атрада капітана Р. Райса на Беласточчыне, то неабходна браць пад увагу меркаванне мясцовых беларусаў як часткі польскага грамадства. Доўгі час яны імкнуцца захоўваць памяць пра трагедыю, якая адбылася ў студзені – лютым 1946 г., аднак гэта барацьба за памяць ідзе ў надзвычай складаных умовах і пры няроўных сілах і магчымасцях.

У 1951 г. целы 27 забітых фурманаў-беларусаў былі эксгумаваны і пахаваны на каталіцкіх могілках у в. Кліхі. Аднак толькі ў 1989 г. блізкія даведаліся пра месца іх апошняга спачыну, а праз некалькі гадоў і пра тое, дзе знаходзяцца астанкі яшчэ трох чалавек. З гэтага часу беларусы, аб'яднаўшыся ў Грамадскі камітэт па эксгумацыі астанкаў асоб, забітых каля в. Старыя Пухалы, пачалі барацьбу з мясцовымі органамі ўлады за перапахаванне забітых на могілках каля царквы ў Бельску-Падляскім. Гэта адбылося толькі ў 1997 г. Аднак узнікла праблема з помнікам, на ўсталяванне якога мясцовыя ўлады не давалі згоды. Ім не падабаўся прапанаваны надпіс: «У знак пашаны да забітых узброеным падполлем», які, паводле іх, быў вельмі агульным. У 2001 г. падляшскі ваявода К. Лукашук афіцыйна выступіла супраць характарыстыкі дзейнасці Р. Райса як злачыннай. Яе падтрымалі Савет аховы памяці барацьбы і пакутніцтва і Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшчы. У выніку грамадскі камітэт быў вымушаны звярнуцца ў суд наконт пытання аб усталяванні помніка [8, s. 82].

Толькі ў 2002 г. на сродкі сямей забітых быў пастаўлены помнік на магіле фурманаў. Надпіс на ім гучыць наступным чынам: «Божа! Няхай у цябе яны маюць тое, што ў іх забралі, а жывыя ніколі не зазнаюць такога лёсу». На бакавых элементах пазначана: «У знак пашаны да забітых Аддзелам хуткай спецыяльнай акцыі НВА капітана Рамуальда Райса (псеўданім – Буры)»[46]. Такім чынам, першапачатковыя надпісы «У гонар іх памяці» і «У знак пашаны да забітых польскім падполлем» былі зняты. Праз некалькі дзён пасля адкрыцця помніка невядомыя аблілі яго гарачым парафінам [8, s. 82].

Гісторыя забойства беларусаў зімой 1946 г. была прадстаўлена ў дакументальным фільме рэжысёра Е. Каліны «…Як і мы даруем…» (1999, у 2 ч.)[47]. Гэты ж сюжэт стаў асновай дакументальнага фільма А. Арнальд «Герой» (2002), у якім яна раскрывала злачынную дзейнасць Р. Райса на Беласточчыне ў першыя пасляваенныя гады[48]. Выхад стужкі выклікаў вялікую дыскусію ў польскім грамадстве і навуковых колах, якая ў тым ліку падштурхнула сем'і забітых выступіць з пратэстам супраць прысуду 1995 г.

Умоўным працягам згаданай гісторыі можна лічыць новы фільм Е. Каліны «Сярожа» (2015)[49], у якім раскрываецца жыццё Сяргея Нічыпарука – ураджэнца в. Залешаны. У абодвух фільмах гэтага рэжысёра назіраецца імкненне паказаць трагедыю людзей у 1946 г. і лёс беларусаў, сем'і якіх яна напаткала, а не рабіць акцэнт на дзейнасці Р. Райса.

Помнік у Бельску-Падляскім не з'яўляецца адзіным месцам памяці беларусаў. У в. Залешаны ў 1965 г. быў пастаўлены помнік жыхарам, якія загінулі зімой 1946 г. На ім быў зроблены надпіс: «19 студзеня 1946 г. банда рэакцыйнага падпол-

[44]IPN: nie prowadzimy nowego postępowania w sprawie Romualda Rajsa «Burego» // Portał historyczny. URL: https://dzieje.pl/aktualnosci/ipn-nie-prowadzimy-nowego-postepowania-w-sprawie-romualda-rajsa-burego (date of access: 26.07.2020).

[45]Czaputowicz o sprawie «Burego»: nowe fakty mogą zmieniać interpretacje [Electronic resource]. URL: https://www.tvp.info/41744029/czaputowicz-o-sprawie-burego-nowe-fakty-moga-zmieniac-interpretacje (date of access: 26.07.2020).

[46]На польскай мове надпіс гучыць так: «W hołdzie pomordowanym przez Oddział PAS NZW kpt. Romualda Rajsa ps "Bury"».

[47]*Kalina J.* …Jako i my odpuszczamy… Cz. 1 [Electronic resource]. URL: https://www.youtube.com/watch?v=ebIQLsXcPsc (date of access: 03.10.2020) ; *Kalina J.* …Jako i my odpuszczamy… Cz. 2 [Electronic resource]. URL: https://www.youtube.com/watch?v=_1xT4iBYtLw (date of access: 03.10.2020).

[48]*Arnold A.* Bohater [Electronic resource]. URL: https://www.youtube.com/watch?v=To8OWLnClbU (date of access: 26.07.2020).

[49]*Kalina J.* Siaroża [Electronic resource]. URL: https://www.youtube.com/watch?v=Evg0jBvjCdM (date of access: 03.10.2020).

ля зверскім чынам забіла 14 чалавек, у тым ліку 6 дзяцей – жыхароў в. Залешаны. Вечная ім памяць. Май 1965 г.»[50] У 2020 г. помнік быў адрамантаваны, праўда, скандал выклікала тое, што гэта было зроблена на сродкі таварыства «Курск», якое лічыцца пракрамлёўскім. Польскія ўлады не знайшлі грошай нават на касметычны рамонт[51].

Памяць пра забітых беларусаў увекавечана і на помніку, які ў 2012 г. быў пастаўлены каля царквы Святога Духа ў Беластоку. Надпіс на ім гучыць наступным чынам: «Праваслаўным ахвярам Другой сусветнай вайны, мучанікам за веру і нацыянальнасць у 1939–1956 гг. Святым Падляшскай зямлі». У аснове помніка стаіць камень, на якім пералічаны некаторыя вёскі, жыхары якіх загінулі ў 1939–1956 гг.: Канцавізна, Папувка, Патокі, Райск, Сыпне, Шпакі, Вулка Выганоўская, Зань, Залешаны[52].

З 2018 г. у Гайнаўцы каля помніка ахвярам войнаў, гвалту і рэпрэсій праходзіць акцыя «Вечная памяць». Яе арганізатары падкрэсліваюць, што падзеі мінулага не павінны дзяліць народы і выхоўваць у іх варожае стаўленне адзін да аднаго. У межах іншага праекта – «Наша памяць» – праводзяцца выставы, арганізаваныя Беларускім гістарычным таварыствам і фондам *Kamunikat.org*, прысвечаныя польска-беларускім адносінам на Падляшшы ў першыя пасляваенныя гады[53]. Іх ініцыятары адзначаюць, што мэтай праекта з’яўляецца «захаванне памяці пра цывільных асоб, што загінулі ў выніку дзеянняў, якія маюць прыкметы генацыду і этнічных чыстак. Наша пазіцыя заключаецца ў памяці пра тыя ахвяры і будаўніцтве помнікаў. Памяць не пра забойцаў, а пра іх нявінных ахвяр. Мы хочам, каб на гэтых помніках былі і надпісы на беларускай мове, бо загінуўшыя былі беларусамі»[54].

У беларускім асяроддзі на працягу ўсяго разглядаемага перыяду тэма трагедыі, якая адбылася ў студзені – лютым 1946 г., пастаянна ўздымаецца ў газеце «Ніва» і часопісе «Праваслаўны агляд» («Przegląd Prawosławny») (падрабязней гл. [9, s. 226–227]), аднак доўгі час нават у размовах з журналістамі гэтых выданняў беларусы баяліся называць свае імёны[55].

У студзені 2020 г. у Залешанах прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды 74-й гадавіны пацыфікацыі вёскі атрадам пад камандаваннем Р. Райса. У іх прынялі ўдзел родныя ахвяр, прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі, дэпутаты сейма ад левых сіл[56].

Польская аўтакефальная праваслаўная царква (ПАПЦ) у чэрвені 2003 г. далучыла людзей, якія загінулі ад рук байцоў атрада Р. Райса, да ліку мучанікаў[57]. Восенню 2019 г. сабор ПАПЦ прыняў рашэнне аб далучэнні забітых фурманаў да ліку мучанікаў хелмскіх і падляшскіх. Урачыстасці з гэтай нагоды прайшлі ў ліпені 2020 г. на тэрыторыі жаночага манастыра Святой Велікамучаніцы Кацярыны ў Залешанах. Пры гэтым падчас мерапрыемстваў не былі названы вінаватыя ў іх забойстве, хаця ўсе разумелі, што гаворка ішла пра атрад Р. Райса[58].

Такім чынам, беларусы Польшчы захоўваюць і транслююць уласны наратыў аб трагедыі 1946 г. Яны жадаюць, каб польская дзяржава афіцыйна прызнала забойствы мірных жыхароў атрадам пад камандаваннем Р. Райса, што праявілася б, напрыклад, у выплаце кампенсацыі сем’ям ахвяр.

---

[50]«Za co zabili tych chłopców, co się jeszcze golić nie zaczęli?» // Magazyn TVN24 [Electronic resource]. URL: https://tvn24.pl/magazyn-tvn24/za-co-zabili-tych-chlopcow-co-sie-jeszcze-golic-nie-zaczeli,85,1699 (date of access: 26.07.2020).

[51]«Trzeba było coś zrobić» – reportaż Źmiciera Kościna // Polskie Radio Białystok [Electronic resource]. URL: https://www.radio.bialystok.pl/reportaz/index/id/178720 (date of access: 27.07.2020) ; *Kościn Ź.* Kontrowersje wokół remontu pomnika ku czci ofiar pacyfikacji w Zaleszanach // Polskie Radio Białystok [Electronic resource]. URL: https://www.radio.bialystok.pl/wiadomosci/index/id/178730 (date of access: 27.07.2020).

[52]Pomnik prawosławnych mieszkańców Białostocczyzny zabitych i zaginionych w latach 1939–1956 [Electronic resource]. URL: https://pl.wikipedia.org/wiki/Pomnik_prawos%C5%82awnych_mieszka%C5%84c%C3%B3w_Bia%C5%82ostocczyzny_zabitych_i_zaginionych_w_latach_1939%E2%80%931956 (date of access: 26.07.2020).

[53]Mieszkańcy Hajnówki upamiętnili ofiary pacyfikacji kilku wsi sprzed 73 lat // Portał historyczny. URL: https://dzieje.pl/aktualnosci/mieszkancy-hajnowki-upamietnili-ofiary-pacyfikacji-kilku-wsi-sprzed-73-lat (date of access: 26.07.2020) ; W Zaleszanach można zobaczyć na fotografiach historię stosunków polsko-białoruskich // Polskie Radio Białystok [Electronic resource]. URL: https://www.radio.bialystok.pl/wiadomosci/index/id/164891 (date of access: 26.07.2020).

[54]Наша памяць / Nasza pamięc / Our memory [Электронны рэсурс]. URL: https://www.facebook.com/pg/naszapamiec/about/?ref=page_internal (дата звароту: 26.07.2020).

[55]На гэта звярнула ўвагу журналістка беластоцкай газеты «Ніва» Ганна Кандрацюк, калі рыхтавала матэрыял пра дзейнасць Грамадскага камітэта па эксгумацыі астанкаў асоб, забітых каля в. Старыя Пухалы. Аўтар тлумачыць імкненне беларусаў застацца ананімнымі бяссіллем і страхам помсты. (Гл.: *Кандрацюк Г.* Нам трэба спяшацца // Ніва. 1997. 9 лют. С. 1, 4).

[56]Cerkiew kanonizuje zamordowanych przez oddział Burego. Uroczystości w Zaleszanach, Szpakach, Puchałach Starych, Zaniach, Maleszach i Brańsku [Electronic resource]. URL: https://bielsk.eu/bielsk-podlaski/29019-cerkiew-kanonizuje-zamordowanych-przez-oddzial-burego-uroczystosci-w-zaleszanach-szpakach-puchalach-starych-zaniach-maleszach-i-bransku (date of access: 27.07.2020).

[57]*Chołodowski M.* Podlaskie. Uroczystości ku czci prawosławnych ofiar żołnierzy «Burego» // Gazeta Wyborcza [Electronic resource]. 2020. 23 lipc. URL: https://bialystok.wyborcza.pl/bialystok/7,35241,26152125,podlaskie-uroczystosci-ku-czci-prawoslawnych-ofiar-zolnierzy.html?disableRedirects=true (date of access: 27.07.2020).

[58]*Próchnicka I.* Cerkiew ogłosiła nowych męczenników podlaskich – ofiary pacyfikacji Zaleszan i okolicznych miejscowości // Portal Historyczny. URL: https://dzieje.pl/dziedzictwo-kulturowe/cerkiew-oglosila-nowych-meczennikow-podlaskich-ofiary-pacyfikacji-zaleszan-i (date of access: 26.07.2020) ; Cerkiew kanonizuje zamordowanych przez oddział Burego. Uroczystości w Zaleszanach, Szpakach, Puchałach Starych, Zaniach, Maleszach i Brańsku [Electronic resource]. URL: https://bielsk.eu/bielsk-podlaski/29019-cerkiew-kanonizuje-zamordowanych-przez-oddzial-burego-uroczystosci-w-zaleszanach-szpakach-puchalach-starych-zaniach-maleszach-i-bransku (date of access: 27.07.2020).

## Заключэнне

З 1990 г. у Польшчы адбываецца перагляд савецкага гістарычнага наратыву, вяртанне забытых імён, ажыццяўляецца спроба даць ацэнку гісторыі XX ст. і знайсці тыя падзеі і тых асоб, якія маглі б стаць знакавымі ў справе аб'яднання польскай нацыі, паспрыяць фарміраванню пачуцця гонару за мінулае і патрыятызму. Сярод тых, каго на працягу апошніх 30 гадоў польскія ўлады прыводзяць у якасці ўзору паводзін і маральнага аўтарытэту, выступаюць салдаты пасляваеннага ўзброенага супраціву, ці «праклятыя салдаты». Аднак у барацьбе за незалежнасць Польшчы яны здзяйснялі не толькі слаўныя ўчынкі. Ганебным бокам іх мінулага выступаюць запалохванне і забойствы мірных жыхароў, знішчэнне вёсак. На Беласточчыне ў дачыненні да мясцовых беларусаў так дзейнічаў атрад на чале з капітанам Р. Райсам (Бурым). І ён быў не адзіным крывавым «героем». Пасля заканчэння вайны ў кожнай беларускай вёсцы былі ахвяры дзейнасці «праклятых салдат».

З сярэдзіны 2000-х гг. у Польшчы праводзіцца гістарычная палітыка, якая з 2015 г. выступае адным з прыярытэтаў у дзейнасці кіруючай партыі «Права і справядлівасць». Імкненне аб'яднаць польскае грамадства на аснове патрыятызму і нацыяналізму, падкрэсліць мартыралагічны складнік польскай гісторыі прывяло да таго, што на публічным узроўні польскія ўлады і галоўны праваднік іх гістарычнай палітыкі – ІНП фактычна адмаўляюць наяўнасць у дзеяннях атрада пад камандаваннем Р. Райса прыкмет генацыду і тлумачаць яго ўчынкі высокімі дзяржаўнымі інтарэсамі. Такая пазіцыя, з аднаго боку, выклікае абурэнне часткі грамадства і вядзе да напружанасці ў польска-беларускіх адносінах, а з другога – спрыяе росту польскага нацыяналізму. Галоўнымі актарамі польскай палітыкі памяці выступае дзяржава, якую прадстаўляюць ІНП, музейныя ўстановы, правыя палітычныя партыі, рухі і грамадскія аб'яднанні, камбатанцкія арганізацыі, з дзейнасцю якіх звязаны члены сям'і Р. Райса, набліжаныя да ўлады СМІ.

Беларусы Падляшша ў гэтай «барацьбе за памяць» выступаюць слабым бокам. Іх пазіцыю трансліруюць беларускія таварыствы і звязаныя з імі СМІ, ураджэнцы Беласточчыны, якія праз мастацкае слова і вобраз спрабуюць данесці шырокім масам гісторыю трагедыі сваіх суродзічаў. Падтрымка існуючых і стварэнне новых месцаў памяці дазваляюць беларусам захаваць у сваім этнічным асяроддзі і на ўзроўні рэгіёна пражывання сведчанні пра падзеі першых пасляваенных гадоў. У адрозненне ад сваіх апанентаў яны імкнуцца дабіцца ад польскіх улад прызнання злачыннымі дзеянняў атрада пад камандаваннем Р. Райса і выплаты кампенсацыі сем'ям ахвяр. У гэтых кроках па захаванні памяці пра трагедыю беларусаў у 1946 г. іх павінны падтрымаць улады Рэспублікі Беларусь, якія могуць выступіць з ініцыятывай усталявання помніка беларусам – ахвярам разглядаемых падзей.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Миллер А. Россия: власть и история. *Pro et contra*. 2009;13(3–4):6–23.
2. Jurek M, Nowak A, Rybicki A, Skibiński P, Kurtyka J, Żaryn J. Polska polityka historyczna [debata]. *Biuletyn Instytutu Pamięci Narodowej*. 2006;5:2–33.
3. Сафронова ЮА. *Историческая память: введение*. Санкт-Петербург: Издательство Европейского университета в Санкт-Петербурге; 2019. 220 с.
4. Chwedoruk R. Polityka historyczna w Europie – periodyzacja i wiodące dyskursy. *Studia Politologiczne*. 2015;35:47–74.
5. Касьянов Г. *Украина и соседи: историческая политика. 1987–2018*. Москва: НЛО; 2019. 631 с.
6. Малинова ОЮ. Коммеморация исторических событий как инструмент символической политики: возможности сравнительного анализа. *Полития*. 2017;4:6–22. DOI: 10.30570/2078-5089-2017-87-4-6-22.
7. Moroz A. *Między pamięcią a historią. Konflikt pamięci zbiorowych Polaków i Białorusinów na przykładzie postaci Romualda Rajsa «Burego»*. Warszawa: IPN; 2016. 258 s.
8. Moroz A. Konflikt pamięci na pograniczu polsko-białoruskim na przykładzie działalności Romualda Rajsa ps «Bury». *Studia z Geografii Politycznej i Historycznej*. 2016;5:61–91. DOI: 10.18778/2300-0562.05.04.
9. Orciuch M. Kontrowersje wokół postaci Romualda Rajsa «Burego» na łamach prasy i w media elektronicznych a polska polityka historyczna. *Białoruskie Zeszyty Historyczne.* 2018;50:219–230.
10. Kułak J. Pacyfikacja wsi białoruskich w styczniu 1946 roku. *Biuletyn Instytutu Pamięci Narodowej*. 2001 Wrzesień;8:49–54.
11. Mironowicz E. *Polityka narodowościowa PRL*. Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne; 2000. 284 s.
12. Вялікі АФ. *На раздарожжы. Беларусы і палякі ў час перасялення (1944–1946 гг.)*. Селяменеў ВД, рэдактар. Мінск: БДПУ; 2005. 319 с.
13. Iwaniuk S. Białoruska samoobrona na Białostocczyźnie w latach 1945–1947 (przyczyny tworzenia i działalność). *Białoruskie Zeszyty Historyczne.* 1995;1(3):57–67.

## References

1. Miller A. [Russia: power and history]. *Pro et contra*. 2009;13(3–4):6–23. Russian.
2. Jurek M, Nowak A, Rybicki A, Skibiński P, Kurtyka J, Żaryn J. Polska polityka historyczna [debata]. *Biuletyn Instytutu Pamięci Narodowej*. 2006;5:2–33.

3. Safronova YuA. *Istoricheskaya pamyat': vvedenie* [Historical memory: an introduction]. Saint Petersburg: Publishing House of the European University in Saint Petersburg; 2019. 220 p. Russian.

4. Chwedoruk R. Polityka historyczna w Europie – periodyzacja i wiodące dyskursy. *Studia Politologiczne*. 2015;35:47–74.

5. Kas'yanov G. *Ukraina i sosedi: istoricheskaya politika. 1987–2018* [Ukraine and its neighbors: historical politics. 1987–2018]. Moscow: NLO; 2019. 631 p. Russian.

6. Malinova OYu. Commemoration of historical events as instrument of symbolic policy: possibilities of comparative analysis. *Politiya*. 2017;4:6–22. Russian. DOI: 10.30570/2078-5089-2017-87-4-6-22.

7. Moroz A. *Między pamięcią a historią. Konflikt pamięci zbiorowych Polaków i Białorusinów na przykładzie postaci Romualda Rajsa «Burego»*. Warszawa: IPN; 2016. 258 s.

8. Moroz A. A memories conflict on the Polish-Belarusian borderland with reference to activity of Romuald Rajs aka «Bury». *Studia z Geografii Politycznej i Historycznej*. 2016;5:61–91. DOI: 10.18778/2300-0562.05.04.

9. Orciuch M. Controversy surrounding Romuald Rajs *nom de guerre* «Bury» in paper and electronic media *vis-à-vis* Polish historical politics. *Białoruskie Zeszyty Historyczne*. 2018;50:219–230.

10. Kułak J. Pacyfikacja wsi białoruskich w styczniu 1946 roku. *Biuletyn Instytutu Pamięci Narodowej*. 2001 Wrzesień;8:49–54.

11. Mironowicz E. *Polityka narodowościowa PRL*. Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne; 2000. 284 s.

12. Vjaliki AF. *Na razdarozhzhy. Belarusy i paljaki w chas perasjalennja (1944–1946 gg.)* [At the crossroads. Belarusians and Poles during the resettlement (1944–1946)]. Seljamenew VD, editor. Minsk: Belarusian State Pedagogical University; 2005. 319 p. Belarusian.

13. Iwaniuk S. Białoruska samoobrona na Białostocczyźnie w latach 1945–1947 (przyczyny tworzenia i działalność). *Białoruskie Zeszyty Historyczne*. 1995;1(3):57–67.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 19.08.2020.*
*Received by editorial board 19.08.2020.*